**І.М.Грамовіч,**
*дацэнт*

# УВАСАБЛЕННЕ ДУХОЎНАСЦІ Ў СПЕВАХ БЕЛАРУСКІХ КАЛЯДНЫХ І ВЕСНАВЫХ ПЕСЕНЬ

Абрадавы песенны фальклор здаўна цікавіў даследчыкаў розных галін навукі: этнографаў, сацыёлагаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, псіхолагаў і інш. Фальклорная спадчына адлюстроўвае гістарычныя і сацыяльныя працэсы, якія перажываў народ.

На сучасным этапе пры вывучэнні песеннага фальклору і перадачы дакладнага гучання песень вельмі важна перадаць праз манеру выканання, якасць гуку адпаведныя атмасферу і эмацыянальны настрой, якім карысталіся нашы продкі, выконваючы тую ці іншую абрадавую песню. У залежнасці ад прызначэння песні мелі розны характар і манеру выканання.

Калядна-навагоднія святы ўяўляюць комплекс розных па характары і прызначэнні песень, якія захоўваюць пэўны сэнс. Вытокі каляднай абраднасці — у язычніцкай даўніне. Царква прыкладала нямала намаганняў, каб ліквідаваць розныя “д’ябальскія” спевы і танцы. Хрысціянская рэлігія падвяла пад старыя звычаі новую ідэалагічную аснову. Так узнікла каляднае хаджэнне з “казой”, са “звяздою”.

Ходзячы невялікімі групамі, калядоўшчыкі ў сваіх песнях жадалі людзям шчаслівага лёсу, атрымання добрага ўраджаю. Іх напевы прасякнуты заклінаннямі, магічнымі дзеяннямі. У многіх абходных песнях услаўляліся гаспадар, гаспадыня і іх дзеці. У такіх песнях звычайна ўжываецца рэфрэн “Коліда, коліда!” або “Каляда, калядзіца”. Шматразовае паўтарэнне рэфрэна надае калядкам рэчытатыўны характар. Афарбоўкай свята служаць шумныя адкрытыя спевы ў час правядзення рытуальных вогнішчаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хаджэння ў масках, пераапранання ў казу, кабылу, мядзведзя.

Бяссілле чалавека перад жорсткай зімой адлюстроўваюць варажба і заклінанні разам са спевамі. Такія прыгаворы, як “Го-го-го, каза”, “Вазьму казла ды за рожачкі”, надавалі спевам адкрытае, свабоднае гучанне і стваралі ўражанне гульні.

Свае асаблівасці маюць “шчадроўкі”. “Таямнічыя”, паўпрыкрытыя спевы гэтых песень выяўляюць імкненне ачышчэння ад граху, павагу да нябесных сіл.

У валачобных песнях, як і ў калядных, пераважае моўны пачатак. Вобразна-інтанацыйная сфера абапіраецца на рознага характару загуканні — гучныя і адкрытыя спевы на вуліцы.

Святочная манера выканання з урачыста-прыўзнятымі воклічамі характэрная спевам валачобнікаў. “Зялён явар зялёны!”, “Вясна-красна на ўвесь свет!”, “Ля-лё, ля-лё, лі-ляй-лё!”—такія прыпевы-рэфрэны суправаджалі адкрытыя, свабодныя спевы валачобнікаў. А вось спевы з рэфрэнам: “Хрыстос васкрэс—сын Божы!” — непасрэдна прымяркоўваліся да свята Вялікадня. У манеры такіх спеваў выяўляецца імкненне чалавека да духоўнага адраджэння.

Спяваючы вяснянкі-загуканні, дзяўчаты выказвалі радасць з прычыны прыходу вясны. Значная частка вясенніх песень (кустаўыя, юраўскія, траецкія) гучаць як заклікі, аб чым сведчыць працяглы вокліч “Гу!” У канцы кожнай страфы ён выконваецца прыёмам пераключэння голасу з груднога рэгістра ў галаўны, з акцэнтам угару, а затым хуткім глісандзіраваным рухам уніз, з абрывам гуку. Вокліч “Гу!”— своеасаблівы прыём магічнага заклінання абагаўлёных сіл прыроды. Спяваўся гэты вокліч з узвышаных месцаў, каб было далёка чуваць. Яднанне з прыродай—галоўная духоўна-эстэтычная мэта такіх спеваў.

Інтанацыя закліку ў вясенніх прызывах мае светлае, усхваляванае і радаснае гучанне.”Вясна красна на ўвесь свет”, “Вясняначка, дзе твая дачка Таццяначка ...Гу!”,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Памажы нам, божа” з’яўляюцца яскравым прыкладам вясенніх загукальных напеваў з выкарыстаннем шырокіх адкрытых спеваў у грудным рэгістры.

Авалодванне народна-песенным выкананнем немагчыма без разумення светапогляду і тых адчуванняў, якія суправаджалі нашых продкаў пры складанні сваіх песень. Гэтыя песні перадаюцца з пакалення ў пакаленне, таму яны захоўваюцца і адначасова набываюць штосьці новае ад кожнага пакалення.

**А.П.Грыцкевіч,**
*прафесар*

## АСВЕТНІЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ ў XVII—XVIII стст.

У канцы XVII ст. у Беларусі пачынаюць пашырацца ідэі ранняга Асветніцтва. Яны праявіліся ў творах С.Полацкага, І.Капіевіча, К.Лышчынскага, А.Белабоцкага. Пашырэнню асветніцкіх ідэй пазней спрыялі таксама выхаванцы Кіева-Магілянскай духоўнай акадэміі Л.Барановіч, Г.Каніскі, Ф.Пракаповіч і інш. Прадстаўнікамі Асветніцтва былі С.Шчука, К.Семяновіч [1].

Асветніцтва як грамадска-палітычная плынь актыўна пашыралася ў XVIII ст. і было падмацавана навуковымі адкрыццямі ў прыродазнаўстве і гуманітарных ведах. На тэрыторыі Беларусі меў перавагу другі кірунак. Тут асветніцкія ідэі адлюстроўвалі супярэчнасці грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай, а таксама агульную палітычную сітуацыю ў Еўропе і ва ўсходнім рэгіёне. Таму спрыяла шырокая сетка навучальных устаноў розных канфесій, і перш за ўсё Віленскі універсітэт. Пашырэнню асветніцкіх ідэй спрыяла праведзеная ў 40—50-я гг. XVIII ст. С.Канарскім рэформа піярскіх школ на тэрыторыі Рэчы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ